КАБ БЫЎ ПАРАДАК

# ХТО ЎДЫХНЕ ЖЫЦЦЁ Ў «МЁРТВЫЯ» АБ'ЕКТЫ?

## На Міншчыне чакаюць добрасумленных інвестараў

**Гаспадыню відаць па тым, як выглядаюць яе дом і падворак. Калі там вэрхал, бруд, то туды і госці не паедуць, і суседзі не завітаюць. Так і ў межах краіны, вобласці, раёна. Пошук новых уласнікаў для будынкаў, якія доўгі час пуставалі, — гэта не самамэта, а жаданне ўлад навесці парадак на зямлі. Таму працэс прыцягнення ў абарот нявыкарыстаных аб'ектаў актывізаваўся ў адносінах да маёмасці ўсіх формаў уласнасці.**

Яшчэ нядаўна будынак былой участковай бальніцы ў гарадскім пасёлку Смілавічы Чэрвеньскага раёна, што на Міншчыне, літаральна раздражняў сваім знешнім выглядам мясцовых жыхароў. Ды і перад гасцямі было няёмка. Драўляная пабудова XVIII стагоддзя разбуралася проста на вачах. І вось знайшоўся ўласнік, які ўзяўся ўдыхнуць у будынак другое жыццё. Ды нешта ў яго не зладзілася, магчыма, не хапіла сродкаў, каб ажыццявіць задуму. Будынак быў перапрададзены іншаму прыватнаму інвестару. За адносна кароткі час прадпрыемству «Нікана» удалося зрабіць тут забаўляльны комплекс, які ўключае кафэ «Новае месца», більярдную, дыскатэку, піцэрыю.

— Нам давялося шмат папрацаваць, каб давесці ўсё да ладу,— расказвае дырэктар установы Мікалай Сямёнаў. — Уладкоўвалі фасады, распрацоўвалі інтэр'ер, добраўпарадкавалі прылеглую тэрыторыю. У найбліжэйшай перспектыве адкрыццё лазні, на трэцім паверсе плануюцца гасцінічныя нумары, а ў двары — дзіцячая пляцоўка. Для таго, каб бацькі змаглі завітаць да нас са сваімі дзеткамі, пакаштаваць нашу кухню, а заадно і пагуляць з малымі.

Сапраўды, у Смілавічах жыве шмат маладых сем'яў, толькі летась тут нарадзілася 102 немаўляці. Дадам, што комплекс працуе з лістапада мінулага года, але ўжо знайшоў сваіх кліентаў. Тут ладзяць карпаратыўныя сустрэчы дарослыя, арганізуюць святы для дзяцей. А работнікі мясцовых арганізацый і прадпрыемстваў заходзяць сюды падсілкавацца. Дарэчы, кошт абеду каля 3 рублёў.

— Я прадпрымальнік з 15-гадовым стажам, — уступае ў размову заснавальніца фірмы Марыя Захаранка. — Акрамя гэтага цэнтра ў мяне ёсць кавярня «Сямёрачка». Вядома, адной з такой гаспадаркай цяжка спраўляцца. Але мне дапамагае сямейная каманда — дачка з зяцем. Лічу, што ў іх нядрэнна атрымліваецца. Спадзяюся, што нашы паслугі будуць усё больш запатрабаваныя ў наведвальнікаў, але ў гэты аб'ект яшчэ шмат трэба ўкласці.




Фотаздымак носіць ілюстрацыйны характар.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Непадалёку ад «Новага месца» — палацава-паркавы комплекс. Сядзіба належала розным уладальнікам: Кежгайлам, Сапегам, Завішам, Агінскім, Ваньковічам... І кожны з іх уносіў новыя элементы ў яе знешні выгляд. Канчаткова комплекс сфарміраваўся ў XIX — пачатку XX стагоддзя. У 1900-м да старога васьміграннага корпуса быў прыбудаваны новы, у неагатычным стылі з элементамі мадэрну. У 1973-м ён быў перабудаваны. Пры гэтым цалкам страціў першапачатковую планіроўку. У выніку — сапсаваны архітэктура фасада і аконныя праёмы, знішчаны ляпны дэкор, парушаны балконы. На працягу савецкага перыяду будынкі пераходзілі з рук у рукі розных арганізацый. А затым наогул пуставалі больш як 20 гадоў. І, вядома, ператварыліся ў небяспечныя развaліны: іх любілі даследаваць мясцовыя дзеці, навучэнцы каледжа. Для такога кшталту пабудоў, якія з'яўляюцца помнікамі культуры і архітэктуры, заўсёды цяжка знайсці інвестара. Уласнік павінен захаваць першапачатковы выгляд аб'екта, усе дэталі аздаблення і выкарыстоўваць яго па прызначэнні. Інакш кажучы, тут нельга адкрыць вытворчасць, а мецэнацтвам, натуральна, ніхто не хацеў займацца. Аднак у 2014 годзе помнік культуры на аўкцыёне набыла літоўская кампанія «ВИНКТЕХТРЕЙД». Да яе гонару, пачаліся актыўныя аднаўленчыя работы. І ў прынцыпе яна спраўляецца з графікам: ужо адрэстаўраваны адзін з карпусоў, засталася толькі ўнутраная апрацоўка. У другім корпусе расчышчаны падвалы, узведзена сцяна. Прычым рэстаўрацыя ідзе пад кантролем Міністэрства культуры.

А вось будынак былога вучэбна-вытворчага камбіната ў вёсцы Астравы Чэрвеньскага раёна пакуль чакае новага гаспадара. Збудаванне — цаглянае, капітальнае, у добрым стане, вакол добраўпарадкаваная тэрыторыя. Але не шанцуе гэтаму аб'екту: 10 разоў выстаўлялі на продаж, у тым ліку дзевяць разоў з паніжэннем кошту на 20%, пяць разоў — на электронным аўкцыёне.

Каб прадаць будынак вучэбна-педагагічнага комплексу дзіцячага сада-базавай школы ў вёсцы Грабянец, правялі аж 15 аўкцыёнаў. Але да гэтага часу ён не запатрабаваны ў інвестараў...

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

**Валянціна ПІВАВАР, старшыня Смілавіцкага сельвыканкама:**

— У гарадскім пасёлку Смілавічы застаўся адзін нявыкарыстаны аб'ект, гэта былая школа-інтэрнат, для якой пакуль не знайшоўся інвестар. Над выкарыстаннем пустуючых будынкаў мы працуем разам з Чэрвеньскім райвыканкамам. У мінулым годзе, напрыклад, райспажыўсаюз прадаў будынак, дзе цяпер месціцца магазін «Дабраном». Новы ўласнік адрамантаваў яго, прывёў у належны стан. Пакупнікі задаволены і асартыментам, і абслугоўваннем.

Акрамя таго, сельвыканкам займаецца ўшчыльненнем населеных пунктаў — разам са Смілавічамі іх у нас 18. Шукаем пустуючыя ўчасткі, рыхтуем на іх дакументацыю і выстаўляем на продаж. Частку з іх выдзяляем грамадзянам, якія стаяць у чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў, пераважна гэта шматдзетныя сем'і. Вырučаныя ад продажу сродкі ўкладваем у добраўпарадкаванне пасёлка. Летась заасфальтавалі вуліцы Рэвалюцыйную, Меліярацыйную, Першамайскую, пачалі парадкаваць вуліцу імя Максіма Горкага. У планах — будаўніцтва дзіцячай пляцоўкі, устаноўка малых архітэктурных формаў, уладкаванне тратуараў. Вельмі добра, што ў палацы Ваньковічаў інвестар мяркуе стварыць музей, выставачную залу, адкрыць гасцініцу, каб турыстам было дзе спыніцца. У нас ёсць што паглядзець: музей Манюшкі, Хаіма Суціна і шмат іншага, не менш цікавага. Адноўлены палацава-паркавы комплекс будзе ўключаны ў турыстычны маршрут. Думаю, гасцей, якія цікавяцца гісторыяй Смілавіч, іх ваколіц, значна прыбавіцца.

**Святлана ДЗЕГЦЯРЭНКА, дырэктар Мінскага абласнога тэрытарыяльнага фонду дзяржаўнай маёмасці:**

— Большасць прыцягальных аб'ектаў прададзена ў 2011—2014 гадах, у тым ліку і для наладжвання вытворчасці. Гэта былыя вытворчыя базы, аб'екты на тэрыторыі Лагойскага і Смалявіцкага раёнаў, паблізу буйных населеных пунктаў. Цяпер у асноўным засталіся нявыкарыстанымі будынкі сацыяльнай сферы: дзіцячыя сады, школы, сельскія клубы. Яны спецыфічныя ў тым плане, што тут не заўсёды можна размясціць вытворчасць, ды і знаходзяцца далёка ад вялікіх паселішчаў. Але прадаць аб'ект — не самае галоўнае. Важна знайсці сапраўднага гаспадара, які б эфектыўна распараджаўся маёмасцю: адкрыў вытворчасць, кавярню, культурна-забаўляльны цэнтр, аб'ект прыдарожнага сервісу. Усе механізмы ў нас адпрацаваны: спачатку выстаўляем «нічыйны» аб'ект на аўкцыён па рынкавым кошце, калі не знаходзіцца ўласнік — зніжаем цану. Здараецца, маёмасць прадаецца, а пакупнік не заключае дагавор куплі-продажу або не выконвае ўмовы дагавора. У такім выпадку аб'ект вяртаецца ў камунальную ўласнасць. Асаблівая характэрная такая сітуацыя для будынкаў, якія набыты пры пачатковай цане ў адну базавую велічыню. Мясцовыя ўлады нядобрасумленных уласнікаў нерухомасці прыцягваюць да адміністрацыйнай адказнасці, павялічваюць стаўку падатку на маёмасць і зямлю ў 10 разоў.

# Крадуць зямлю

**У Столінскім раёне і ваколіцах распаўсюджана спецыфічнае парушэнне прыродаахоўнага заканадаўства — тут крадуць урадлівы слой зямлі з лясоў і перавозяць глебу на ўласныя цяпліцы.**

Як паведаміў **начальнік Столінскай міжраённай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету Генадзь СЫСА**, у год інспектары выяўляюць да дзясятка парушэнняў, звязаных са знішчэннем урадлівага слою зямлі ў лясных угоддзях. Нярэдка ў іх поле зроку трапляюць жыхары Альшанаў і другіх вёсак, якія такім чынам здабываюць грунт для расады. Так, у Дубайскім лясніцтве Столінскага лясгаса днямі былі затрыманыя двое жыхароў раёна, якія лапатамі знялі ўрадлівы слой глебы на ўчастку плошчай 40 квадратных метраў. Нават мароз і снег не сталі ім перашкодай. Грамадзяне прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці. Яны мусяць кампенсаваць урон, нанесены прыродзе, у памеры 920 рублёў, а яшчэ ім пагражае штраф да 20 базавых велічынь.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

НУ І НУ!

## САМАГОН ЛІЎСЯ РАКОЙ У ЛІК ПАГАШЭННЯ ДАЎГОЎ

**Менавіта такі незвычайны спосаб разлічыцца са штрафамі выбраў жыхар вёскі Маліноўшчына Мінскай вобласці.**

Як паведамляе Ленінскі РУУС г. Мінска, чые супрацоўнікі праводзілі затрыманне, у прысядзібнай прыбудове, якая была перааbсталяваная пад міні-завод па вытворчасці спіртазмяшчальнай вадкасці, праваахоўнікі канфіскавалі больш за 2,5 тысячы літраў брагі і каля 300 літраў гатовага прадукту. Уладальнікам усяго гэтага «багацця» быў 25-гадовы непрацуючы жыхар вёскі, які, дарэчы, сам алкагольныя напоі не ўжывае. Самагонаварэннем мужчына займаўся выключна для атрымання грошай, за што неаднаразова прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці. Але працягваў гнаць самагон, каб у тым ліку пагашаць раней накладзеныя адміністрацыйныя спагнанні. Вяскоўцу пагражае штраф памерам да 30 базавых велічынь. Дзейнасцю парушальніка зацікавілася і інспекцыя прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Праводзіцца праверка.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*